**24.** У вершы П. Панчанкі “Апошні хутаранін” ёсць радкі:

*Вазы адскрыпелі ў нізіне.*
*І стаў аглушальны спакой.*

Які стылістычны прыём выкарыстаны паэтам у гэтых радках?

**А)** антытэза. **Б)** аксімаран. **В)** метанімія. **Г)** антанамазія. **Д)** афарызм.

**25.** Хто з беларускіх мовазнаўцаў сказаў: *“Я прыродны беларус, усё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню гэтага народа”*?

**А)** В. І. Баркоўскі. **Б)** Б. А. Тарашкевіч. **В)** Язэп Лёсік.
**Г)** М. Пачобут-Адляніцкі. **Д)** Я. Ф. Карскі.

**26.** Эўфемізмы – гэта ... сінонімы

**А)** стылістычныя. **Б)** абсалютныя. **В)** марфалагічныя.
**Г)** сінтаксічныя. **Д)** кантэкстуальныя.

**27.** Хто выдаў у 1870 годзе “Словарь белорусского наречия”, які і сёння не страціў сваёй каштоўнасці?

**А)** М. Федароўскі. **Б)** І. І. Насовіч. **В)** М. І. Каспяровіч.
**Г)** С. М. Некрашэвіч. **Д)** М. Я. Байкоў.

**28.** Калі не трэба пісаць прыстаўны *і*?

*1) у пачатку слоў перад збегам зычных;*
*2) у пачатку слоў перад літарамі м, р, л;*
*3) пасля знакаў прыпынку;*
*4) у сярэдзіне слова пасля прыстаўкі на галосны;*
*5) у складаным слове, калі першая частка заканчваецца на галосны.*

**А)** усе варыянты правільныя. **Б)** няма правільнага варыянта.
**В)** 1, 3, 5. **Г)** 3, 4, 5. **Д)** 4, 5.

**29.** У якіх словах з прыведзеных адбываюцца гістрычныя чаргаванні галосных?

*1) лес – лясы; 2) граблі – грэбці; 3) вязаць – вузел; 4) воз – вазы;*
*5) просьба – прасіць; 6) сохнуць – сухі; 7) везці – вёз.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 4, 5, 6. **Г)** 2, 3, 6, 7. **Д)** 4, 5, 6.

**30.** Каго з беларускіх пісьменнікаў Адам Кіркор называў *“другім з выдатнейшых паэтаў і празаікаў”* пасля В. Дуніна-Марцінкевіча?

**А)** Вярыгу-Дарэўскага Арцёма Ігнатавіча.
**Б)** Азёмшу Івана Паўлавіча.
**В)** Гарбачэўскага Івана Данілавіча.
**Г)** Доўнара-Запольскага Мітрафана Віктаравіча.
**Д)** Драздовіча Язэпа Нарцызавіча.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА.*
*тэл. (017) 232 80 31, 292 34 01; e-mail: info@bakonkurs.org http://www.bakonkurs.org/*

ГА «Беларуская асацыяцыя «Конкурс». Заказ 12. Тыраж 14000 экз. г. Мінск. 2007 г.

# Конкурс па беларускай мове
# “БУСЛІК-2007”

*Чацвер, 15 лютага 2007 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна адказалі на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 9(11)-10-11 класаў

**1.** Літары мы пішам, а гукі...

**А)** бачым. **Б)** вымаўляем. **В)** малюем. **Г)** чуем. **Д)** не чуем.

**2.** Закончыце народную прыказку: *няма смачнейшай вадзіцы, ...*

**А)** як з калодзежа. **Б)** як з возера напіцца. **В)** як з роднай зямліцы.
**Г)** як з роднай крыніцы. **Д)** як з радзімай хаты.

**3.** Вызначце, дзе ў скарочаным выглядзе запісаны беларускія назвы дзён тыдня:

*1) г. д.; 2) чцв; 3) сбт; 4) мн. л.; 5) зб; 6) гг; 7) млн.*

**А)** няма такіх запісаў. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 2, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4, 5.

**4.** Колькі разоў вымаўляецца гук [*б’*] у скорагаворцы Х. Ляшкевіч?

*З бабранятамі бабры*
*Робяць грэблю ў бары.*
*Рады ўвесь бабрыны род:*
*Будзе грэбля цераз брод.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 9. **Д)** 10.

**5.** Колькі літар уваходзіла ў склад кірыліцы?

**А)** 39. **Б)** 41. **В)** 43. **Г)** 45. **Д)** 47.

**6.** У якіх прыметніках замест кропак напішаце канчатак *-ая*?

*1) свеж.. кальрабі; 2) шэр.. шынель; 3) куплен.. івасі;*
*4) даўн.. вета; 5) нечакан.. роспач; 6) непрыемн.. боль.*

**А)** ва ўсіх прыметніках. **Б)** ва ўсіх прыметніках, акрамя 4.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 4, 5, 6.

**7.** Выберыце з прапанаваных толькі адназначныя літары.

*1) в; 2) а; 3) о; 4) л; 5) ш; 6) ў; 7) ы.*

**А)** усе літары адназначныя. **Б)** няма адназначных літар.
**В)** 1, 3, 5, 7. **Г)** 2, 3, 5, 6, 7. **Д)** 2, 4, 6, 7.

**8.** Пра каго з герояў паэмы “Новая зямля” Якуб Колас напісаў:

*А вочы шэры, невялічкі,*
*Глядзяць прыветна, як сунічкі...*
*Але раптоўна і адразу*
*Не расчытаеш іх выразу:*
*То смех, то хітрасць з іх бліскае,*
*То дабрата, але якая!*

**А)** пра дзядзьку Антося. **Б)** пра Міхала. **В)** пра Ганну.
**Г)** пра Яську. **Д)** пра Кастуся.

**9.** Пра якую рэч расказваецца ў мініяцюры А. Разанава?

*Калі яе адчыняюць, яна скардзіцца, яна скрыпае. У ёй захоўваецца скрытае – скарб. Ім яна поўная, ім змястоўная, ім ацэньваецца яе вартасць. Усе думаюць, што яна скнара, што яна “рынак”, але сама... ведае, што яна скрыпка, у якой няма струн.*

**А)** пра шафу. **Б)** пра балалайку. **В)** пра мандаліну. **Г)** пра скрынку. **Д)** пра гітару.

**10.** У якіх прыкладах напішаце часціцу ***не*** разам? Выберыце правільныя варыянты:

*1) (не)далічыліся двух чалавек;*
*2) бывае, і гаспадар (не)даважвае насення;*
*3) надзвычай (не)цікавая кніга;*
*4) яшчэ (не)езджаная дарога;*
*5) быў тут (не)аднойчы;*
*6) ледзь (не)плачучы.*

**А)** ва ўсіх выразах. **Б)** 1, 2, 3. **В)** 2, 3, 4. **Г)** 3, 5, 6. **Д)** 5, 6.

**11.** Якія словы з прыведзеных з’яўляюцца гістарызмамі:

*1) рацьʼ; 2) стражнік; 3) піка; 4) пляц; 5) кампед; 6) МТС; 7) лгар; 8) сявярня.*

**А)** усе словы. **Б)** няма гістарызмаў. **В)** 1, 3, 6, 7. **Г)** 2, 3, 5, 6. **Д)** 4, 7, 8.

**12.** Дадзены словы беларускай мовы: *1) глог; 2) ядловец; 3) арэшына* – і далей іх адпаведнікі ў рускай мове: *4) можжевельник; 5) лещина; 6) боярышник*. Вызначце правільныя пары.

**А)** 1–6, 2–4, 3–5. **Б)** 1–4, 2–5, 3–6. **В)** 1–5, 2–4, 3–6.
**Г)** 1–6, 2–5, 3–4. **Д)** няма правільных пар.

**13.** Вучні пісалі сачыненне пра падарожжа літаратурных герояў. Янка запісаў на чарнавіку некалькі варыянтаў аднаго сказа. Дапамажыце хлопчыку выбраць сказ, запісаны без памылак.

**А)** У дарозе падарожнікі былі ўжо чацвёра сутак.
**Б)** У дарозе падарожнікі былі ўжо чатыры суткі.
**В)** У дарозе падарожнікі былі ўжо чацвёра суткі.
**Г)** У дарозе падарожнікі былі ўжо чатыры сутак.
**Д)** У дарозе падарожнікі былі ўжо чацвёра суткаў.

**14.** Пераблыталіся літары. Але ж з іх можна скласці слова, якога не хапае ў народнай прыказцы: *Не варта ... біць каля зубоў*. Выберыце правільны варыянт.

**А)** ы, к, з, я. **Б)** э, р, а, х. **В)** с, н, о. **Г)** я, р, о, н, з. **Д)** а, к, в, о.

**15.** У якіх словах пасля прыстаўкі напішаце *й*?

*1) непры..манне; 2) па..менна; 3) без..дэйны;*
*4) за..грываць; 5) пера..менаваць; 6) за..мець.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2, 4, 5, 6.
**Г)** 2, 5, 6. **Д)** 3, 4.

**16.** Як называецца навука, якая вывучае прыказкі і прымаўкі?

**А)** графіка. **Б)** парцэляцыя. **В)** лексікаграфія.
**Г)** парэміялогія. **Д)** лінгвакультуралогія.

**17.** З якога часу ў беларускіх тэкстах выкарыстоўваецца літара *й*?

**А)** з XIV стагоддзя. **Б)** з XV стагоддзя. **В)** з XVI стагоддзя.
**Г)** з XVII стагоддзя. **Д)** з XVIII стагоддзя.

**18.** Якому дню па рашэнні ЮНЭСКА нададзены ў 2000 годзе міжнародны статус Дня роднай мовы?

**А)** 1 снежня. **Б)** 7 студзеня. **В)** 21 лютага. **Г)** 25 сакавіка. **Д)** 1 верасня.

**19.** Выберыце з прыведзеных вобразных сродкаў толькі тыя, што адносяцца да тропаў:

*1) эпітэт; 2) параўнанне; 3) алегорыя; 4) метафара;*
*5) метанімія; 6) сінекдаха; 7) перыфраза.*

**А)** усе тэрміны. **Б)** усе тэрміны, акрамя 5.
**В)** усе тэрміны, акрамя 7. **Г)** толькі 1, 2, 4. **Д)** толькі 3, 6.

**20.** Якое сапраўднае прозвішча Сімяона Полацкага?

**А)** Казімір Крыштоф Клакоцкі.
**Б)** Францішак Ксаверый Міхал Богуш.
**В)** Стафан Аляксандравіч Бутаўт-Андрайковіч.
**Г)** Самуіл Емельянавіч Пятровіч-Сітніяновіч.
**Д)** Вікенцій Васілевіч Макушаў.

**21.** Хто з беларускіх асветнікаў прапанаваў Пятру Першаму ўзоры літар грамадзянскага алфавіта?

**А)** Ільля Капіевіч. **Б)** Афанасій Філіповіч. **В)** Ліцыній Намыслоўскі.
**Г)** Лаўрэнцій Зізаній. **Д)** Казімір Клакоцкі.

**22.** Вызначце гістарычную паслядоўнасць развіцця пісьма:

*1) піктаграфія; 2) іерогліфы; 3) літарнае пісьмо; 4) ідэаграфія.*

**А)** 1, 3, 2, 4. **Б)** 1, 4, 2, 3. **В)** 2, 3, 1, 4. **Г)** 3, 2, 4, 1. **Д)** 4, 1, 3, 2.

**23.** Зычныя гукі ў беларускай мове класіфікуюцца...

*1) паводле ўдзелу голасу;*
*2) паводле ўдзелу голасу і шуму;*
*3) паводле цвёрдасці і мяккасці;*
*4) паводле спосабу ўтварэння;*
*5) паводле месца ўтварэння;*
*6) паводле месца знаходжання.*

**А)** усе сцвярджэнні правільныя. **Б)** 1, 6.
**В)** 1, 4, 5, 6. **Г)** 2, 3, 4, 5. **Д)** 3, 4, 5, 6.